# З артыкула Аляксея Талстога "Асвейская трагедыя"

**Жудасная крывавая трагедыя разыгралася нядаўна ў Асвейскім раёне Віцебскай вобласці.**

У страшэнную пустыню ператварыўся гэты прыгожы куток зямлі беларускай. У ім нельга пазнаць ранейшы цудоўны азёрны край, шчодры і багаты. Усё, што доўгія гады стваралі тут асвейскія калгаснікі, загінула пад цяжкім ботам нямецкіх катаў-акупантаў.

Усяго некалькі дзён лютавала тут арда нямецкіх карнікаў. За гэтыя некалькі дзён заплечных спраў майстры дашчэнту спалілі ўсе 158 населеных пунктаў раёна (3450 жылых дамоў), спалілі раённы цэнтр Асвею і мястэчка Каханавічы, спалілі 9 дамоў сацкультуры, 12 сярэдніх і 90 няпоўных сярэдніх школ, 4 дзіцячыя дамы, 6 бальніц і 2 ветлячэбніцы, 3 машынна-трактарныя станцыі і 3 вялікія млыны. Нямецкія варвары не пашкадавалі і святыні веруючых: яны спалілі дзве праваслаўныя царквы і тры касцёлы. З халодным садызмам дзікіх звяроў немцы-карацені спалілі жывымі і ўтапілі ў рацэ Свольна 3639 мірных жыхароў. І хто ж яны? Гэта 2118 дзяцей да 12-гадовага ўзросту. Гэта 310 старыкоў звыш 50-гадовага ўзросту.

І гэта яшчэ не ўсё. Карнікі схапілі і пагналі на катаргу ў праклятую Нямеччыну 2615 мужчын і жанчын. Грабежнікі-немцы забралі ў насельніцтва апошнюю жывёлу, увесь хлеб і хатнія пажыткі савецкіх людзей.

Ахвяры нямецкага тэрору падвяргаліся жудасным катаванням і здзекам. На грудзях і спіне 8-гадовага хлопчыка Юхневіча (вёска Бяляны) нямецкія каты выразалі пяціканцовыя зоркі, а затым кінулі яго ў палаючы дом. Ягонай мацеры яны адрэзалі грудзі, а сямігадовай сястрычцы Веры нажом распаролі жывот. Затым іх таксама кінулі ў бушуючае полымя. Такі ж страшэнны лёс напаткаў сям'ю Жоравых з вёскі Барысова. Знявечаныя, але яшчэ жывыя, жанчыны і дзеці былі ўтоплены ў рацэ Свольна.

Адрэзванне грудзей, вырэзванне пяціканцовых зорак на спінах савецкіх людзей — гэта яшчэ не ўвесь арсенал жахлівых нямецкіх катаванняў. Многім сваім ахвярам немцы выкручвалі рукі і ногі, скручвалі галовы. У некаторых вёсках немцы нават насаджвалі на калы дзяцей — хлопчыкаў і дзяўчынак.

Гэтыя жудасныя катаванні прымяняліся ў масавым парадку. Знявечаных і паўжывых людзей акупанты, звычайна, зганялі ў адзін дом, свіран або пуню. Наглуха зачыніўшы будынак, яны аблівалі яго бензінам і падпальвалі. Людзі гарэлі, паміралі павольнай, пакутлівай смерцю.

Большасць сваіх ахвяр немцы вынішчалі шляхам спальвання. Вось асобныя вытрымкі з акта аб зверствах нямецка-фашысцкіх акупантаў у Сухарукаўскім сельсавеце:

"...Вёска Мукведзіца, якая складалася з 25 двароў, спалена поўнасцю. Знойдзены трупы 13 зажыва спаленых і 1 расстралянага мірных жыхароў. Узрост, імёны загінуўшых устанавіць не ўдалося.

Вёска Чарнікова, якая складалася з 18 двароў, спалена поўнасцю. Знойдзены трупы 20 зажыва спаленых мірных жыхароў.

Вёска Каралёва — 25 двароў — спалена поўнасцю. Знойдзены 16 трупаў зажыва спаленых мірных жыхароў, старыкоў і дзяцей..."

Такі ж страшэнны малюнак і ў астатніх дзевяці знішчаных вёсках гэтага сельсавета, ва ўсіх 158 знішчаных населеных пунктах раёна, у раённым цэнтры Асвея і мястэчку Каханавічы, у вялікіх пасёлках Задзежжа і Зайцава.

А катаванні бізунамі і гумавымі палкамі, падвешванне на крук за скіvіцу ці рэбры, масавае гвалтаванне дзяўчат і жанчын! Усяго не пералічыш. Немцы — вопытныя каты. Яны, па магчымасці, замяталі сляды сваіх злачынстваў. Яны знішчалі, спальвалі і тапілі ўсіх, хто трапіў ім у рукі. Так, моў, лепш — не будзе сведак, не будзе абвінаваўцаў.

Але абвінаваўцы ёсць! Ёсць і мсціўцы! Гэта — паўстаўшы беларускі народ, гэта — узброеныя народы Савецкага Саюза. І калі сёння нямецкія злачынцы яшчэ не ўсе злоўлены, калі яны яшчэ прадаўжаюць спальваць і катаваць нашых людзей, то заўтра іх агідныя трупы будуць гойдацца ў петлях на плошчах нашых гарадоў і сёл. Мы адпомсцім! У дзень расплаты мы прыпомнім ім і зруйнаваны куток беларускай зямлі, прыпомнім ім Асвейскую трагедыю.

Мацней сціскай вінтоўку, партызан! Да помсты цябе кліча кроў замучаных савецкіх людзей. Жыві толькі адной думкай, толькі адным імкненнем — біць акупантаў.

Вораг лютуе, бо адчувае блізасць сваёй катастрофы. Вогненнае кальцо вакол зграі гітлераўскіх забойцаў з кожным днём сціскаецца. Б'е і гоніць немцаў на захад наша слаўная Чырвоная Армія. Узмацняюць свае ўдары па гітлераўскай Германіі нашы саюзнікі — Англія і Злучаныя Штаты Амерыкі. Не мінаваць фашысцкім катам справядлівай кары за ўсе свае брудныя і крывавыя справы.

Дзвінская праўда. 2008. 29 лютага